Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА "Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры
і мастацтваў"
__________________Ю.П.Бондар
"____"________________2010 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГЕРМЕНЕЎТЫКА КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная)*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Мінск 2010

**Складальнікі:**

*І.В.Марозаў,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар культуралогіі, прафесар;

*А.І.Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар культуралогіі, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*Э.А.Усоўская,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт", кандыдат культуралогіі, дацэнт;

*В.Р.Языковіч,* загадчык кафедры філасофіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 22.01.2010 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 16.03.2010 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А.І.Смолік*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Герменеўтыка ўзнікла і развівалася ў канкрэтных формах – разумення сакральных, гістарычных і мастацкіх тэкстаў. Шлеермахер на падставе канкрэтнай герменеўтыкі стварыў універсальную філасофскую герменеўтыку як агульную тэорыю пазнання. У поўнай меры філасофская герменеўтыка афармляецца ў працах Г.-Г.Гадамера, В.Дзільтэя, Э.Бэці, М.Хайдэгера і інш. У іх працах герменеўтыка паўстае як мастацтва разумення не аб’ектыўных сэнсаў, а індывідуальнасцей, якія мысляць. Такім чынам узнікла філасофская тэорыя аб анталогіі разумення і эпістэмалогіі інтэрпрэтацыі. Герменеўтыка сёння паўстае ў філасофіі, гуманітарных ведах і культуры ў цэлым як адна з фундаментальных форм асэнсавання чалавечага духоўнага вопыту, спосабу яго быцця як разумення. Таму вывучэнне сусветнай культуры з дапамогай інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў і прызнаннем канструктыўнай ролі “часавай дысцыпліны” паміж стварэннем тэксту і яго тлумачэннем набывае асаблівае значэнне. Веданне тэорыі і актуальных прынцыпаў інтэрпрэтацыі дазваляе далучыцца да духоўнага вопыту мінулых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасці для ўсебаковага развіцця асобы і фарміравання агульначалавечых ідэалаў. Праз культуру можна далучыць маладых людзей да аксіялагічнага боку быцця. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалізаваць толькі сістэматызаваным, лагічна пабудаваным вучэбным працэсам. Самастойна авалодаць скарбамі сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, немагчыма. Акрамя таго, сёння ні адна з’ява, што мае дачыненне да гуманітарнай сферы, не можа быць разгледжана без культуралагічнага кантэксту: без яго любы дыскурс ужо будзе няпоўным.

Праграма разлічана на студэнтаў вышэйшых навучальных установаў і ўлічвае папярэдне атрыманыя веды па гуманітарных дысцыплінах (гісторыі Беларусі, эканамічнай тэорыі, філасофіі, паліталогіі, педагогіцы, асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы), веданне ў цэлым асаблівасцей культурных эпох і атрыманне пэўных звестак па розных відах мастацтва.

У праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па айчыннай гісторыі, беларускай і сусветнай літара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры, этнаграфіі, мастацкай культуры, філасофіі, фальклarыстыцы і некаторых іншых дысцыплінах.

Праграма арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж гуманітарнымі і ўласна культуралагічнымі праблемамі. Прычым мастацкая культура разглядаецца як індыкатар стану ўсёй культуры.

Праграма прадугледжвае сістэматызаванае вывучэнне тэарэтыка-практычнага матэрыялу, неабходнага менавіта студэнтам для лепшага засваення імі асноўных дысцыплін спецыялізацыі.

*Мэты* дысцыпліны:

– паглыбленне сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі культуры;

– раскрыццё сутнасці культуры і заканамернасцей яе дынамікі;

– асэнсаванне герменеўтычнага спосабу разумення і тлумачэння тэкстаў культуры;

– фарміраванне ў студэнтаў навуковага герменеўтычнага падыходу да вывучэння з’яў культуры, якi грунтуецца на сучаснай тэорыі герменеўтыкі.

*Важнейшымі задачамі* дысцыпліны з’яўляюцца:

– выяўленне ўніверсалізацыі герменеўтычнай праблематыкі;

– вызначэнне месца і ролі рамантычнай, гістарычнай герменеўтыкі ў разуменні тэкстаў культуры;

– асэнсаванне законаў герменеўтыкі;

– азнаямленне з ідэямі класічнай і сучаснай герменеўтыкі;

– паказ значэння герменеўтыкі, фактычнасці і герменеўтычнага праекта для аналізу сацыякультурнага свету.

У выніку засваення вучэбнага курса “Герменеўтыка культуры” студэнты павінны *ведаць:*

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады герменеўтыкі, якія забяспечваюць разуменне культурна-гістарычнага працэсу;

– гісторыю ўзнікнення і развіцця герменеўтычных канцэпцый;

– асноўныя законы герменеўтыкі;

– сэнс канфлікту інтэрпрэтацый;

– праблемы сучаснай філасофскай герменеўтыкі;

– прыкладныя магчымасці герменеўтычнага метаду разумення тэкстаў культуры;

– асноўныя кірункі герменеўтычнай думкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– суадносіны анталогіі разумення з эпістэмалогіяй інтэрпрэтацый;

– асноўныя культурныя дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

– спецыфічныя падыходы да тэксту, інтэрпрэтацыі ў герменеўтыцы і дэканструвізму.

Студэнты павінны *ўмець:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– крытычна ўспрымаць герменеўтычныя канцэпцыі;

– ацэньваць асаблівасці герменеўтычнага падыходу да асэнсавання культуры;

– пераносіць герменеўтычную мадэль у сацыякультурную галіну ведаў;

– аналізаваць сацыякультурныя працэсы з дапамогай метадаў герменеўтыкі;

– вызначаць суб'ект і аб'ект пазнання;

– вызначыць тэму і праблемы размежавання стратэгій герменеўтычнай інтэрпрэтацыі;

– выяўляць тыпы паводзін інтэрпрэтатара;

– аналізаваць істотныя характарыстыкі пазнання.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

– метад аналізу канкрэтных сітуацый;

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролявых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

На вывучэнне дысцыпліны "Герменеўтыка культуры" вучэбным планам прадугледжана 42 гадзіны аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20, семінары – 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі |
| ***Тэма 1.*** Уводзіны | 2 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Інфармацыйна-тэксталагічнае разуменне культуры | 2 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Феномен прасторава-часавага змянення | 2 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Семіялогія культуры | 2 | 2 |
| ***Тэма 5.*** Архетыпы і культура | 2 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Месца | 2 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Пераход | 2 | 2 |
| ***Тэма 8.*** Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Шлях | 2 | 2 |
| ***Тэма 9.*** Сакральныя архетыпы і іх інтэрпрэтацыя ў розных культурах | 2 | 2 |
| ***Тэма 10.*** Тэксталагічная кампаратывістыка культур | 2 | 4 |
| Разам… | 20 | 22 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Тэма 1. Уводзіны*

Значэнне дысцыпліны “Герменеўтыка культуры” ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы культуры. Прадмет, змест, структура вучэбнага курса. Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Віды вучэбных заняткаў і формы кантролю. Крыніцы і вучэбная літаратура па курсе.

Адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял дадзенай дысцыпліны.

## *Тэма 2. Інфармацыйна-тэксталагічнае разуменне культуры*

Культура як інфармацыйны працэс. Узроўні інфармацыйнага патоку. Семантычныя якасці інфармацыі. Праблема інтэрпрэтацыі тэкстаў культуры. Герменеўтычны круг. Культура як тэкст.

## *Тэма 3. Феномен прасторава-часавага змянення*

Прасторава-часавая лакамоцыя і яе ўплыў на развіццё ўяўленняў чалавека аб свеце. Рэфлексія чалавека, народжаная ў прасторы часу. Шляхі паведамлення і самабытнасць культур.

## *Тэма 4. Семіялогія культуры*

Знакі, знакавасць як умова і сродак фарміравання тэкстаў. Тыпалогія знакаў. Анталогія, генезіс знакаў і паходжанне мастацкай творчасці. Анталогія і фенаменалогія пісьменнасці.

## *Тэма 5. Архетыпы і культура*

Сутнасць архетыпа і яго значэнне ў даследаванні, разуменні і інтэрпрэтацыі феноменаў культуры. Разуменне архетыпа ў канцэпцыі К.-Г.Юнга. Тыпалогія архетыпаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Месца*

Архетып Месца і яго тэксталагічнае значэнне ў станаўленні культуры. Разнастайнасць інтэрпрэтацый архетыпа Месца і яго архетыпічныя атрыбуты: Цэнтр, Мяжа, Імя. Сусветная гара і Сусветнае дрэва, Востраў, Сцяна, Скрыжаванне як архетыпічныя, міфалагічныя сродкі выяўлення Месца і іх сучасныя інтэрпрэтацыі.

### *Тэма 7. Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Пераход*

Архетып Пераходу і яго тэксталагічнае значэнне для разумення свету. Семантычнае і сімвалічнае значэнне Пераходу. Шматстайнасць інтэрпрэтацый архетыпа Пераход. Праём, Спуск – Уздым, Брама, Мост.

### *Тэма 8. Сутнасць і інтэрпрэтацыі архетыпа Шлях*

Архетып Шляху і яго тэксталагічнае значэнне ў развіцці культуры. Семантычнае і сімвалічнае значэнне Шляху. Шматстайнасць інтэрпрэтацый архетыпа Шлях. Тунэль, Лесвіца, Лабірынт, Тупік як архетыпічныя і міфалагічныя сродкі выяўлення Шляху і іх сучасныя інтэрпрэтацыі.

### *Тэма 9. Сакральныя архетыпы і іх інтэрпрэтацыя ў розных культурах*

Сакралізацыя архетыпаў і іх іерархічная тыпалогія. Хата, Храм, Ідэальны горад у кантэксце святой тапаграфіі. Фактары і эвалюцыя інтэрпрэтацыі сакральных архетыпаў.

### *Тэма 10. Тэксталагічная кампаратывістыка культур*

Падставы, прынцыпы і магчымасці кампаратывістыкі культур з пазіцыі герменеўтыкі. Тэксталагічныя асаблівасці культуры Усходу. Тэксталагічная своеасаблівасць культуры Захаду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Антология*: новая постиндустриальная волна на Западе. – М.: Academia, 1999. – 640 с.

2. *Гачев, Г.* Национальные образы мира / Г.Гачев. – М.: Сов. писатель, 1988. – 447 с.

3. *Гуревич, П.С.* Культурология / П.С.Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.

4. *Иконникова, С.Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С.Н.Иконникова. – СПб.: Санкт-Петербург. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.

5. *Кармин, А.С.* Культурология / А.С.Кармин. – СПб.: Питер, 2001. – 464 с.

6. *Лотман, Ю.М.* Семиосфера / Ю.М.Лотман. – СПб.: Искусство, 2000. – 704 с.

7. *Маркарян, Э.С.* Теория культуры и современная наука / Э.С.Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.

8. *Смолік, А.І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

*Дадатковая*

1. *Барт, Р.* Избранные работы. Семиотика. Поэтика / Р.Барт. – М.: Прогресс: Универс: Рея, 1989. – 616 с.

2. *Бахтин, М.М.* Эстетика словесного творчества / М.М.Бахтин. – М.: Искусство, 1979. – 423 с.

3. *Вебер, М.* Избранное: протестантская этика и дух капитализма / М.Вебер // Избранные произведения / М.Вебер. – М.: Российская полит. энцикл., 2006. – 651 с.

4. *Каган, М.С.* Философская теория ценностей / М.С.Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

5. *Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я.Крук. – Мн.: Беларусь, 2001. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Ницше, Ф.* Рождение трагедии, или Эллинство и пессимизм / Ф.Ницше // Сочинения: в 2 т. / Ф.Ницше. – М.: Мысль, 1990. – Т. 1. – С. 47–158.
7. *Сартр, Ж.П.* Экзистенциализм – это гуманизм / Ж.П.Сартр // Сумерки богов. – М., 1989. – С. 91–104.
8. *Тайлор, Э.Б.* Первобытная культура / Э.Б.Тайлор. – М.: Наука, 1989. – 612 с.
9. *Тейяр де Шарден, П.* Феномен человека / П.Тейяр де Шарден. – М.: Наука, 1987. – 240 с.
10. *Франкл, В.* Человек в поисках смысла / В.Франкл. – М.: Прогресс, 1990. – 368 с.
11. *Фуко, М.* Слова и вещи: археология гуманитарных наук / М.Фуко. – СПб.: A-cad, 1994. – 408 с.
12. *Хайдеггер, М.* Время и бытие / М.Хайдеггер. – М.: Республика, 1993. – 447 с.
13. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г.Юнг. – М.: Канон, 1994. – 320 с.
14. *Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К.Ясперс. – М.: Политиздат, 1991. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГЕРМЕНЕЎТЫКА КУЛЬТУРЫ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная)*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,70. Ул.-выд. арк. 0,33.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ